# ФІНАНСАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРХІЎНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ Ў 40-Х – ПАЧАТКУ 60-Х ГГ. XIX СТ.

***А. У. Ерашэвіч***

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,*
*пр. Партызанскі, 26, 220070, г. Мінск, Беларусь, erash06@rambler.ru*

У артыкуле пераважна на аснове архіўных матэрыялаў раскрываюцца аспекты фінансавага забеспячэння арганізацыі і дзейнасці некаторых дзяржаўных архіўных устаноў Беларусі ў 40-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. Зроблена шэраг удакладненняў і дапаўненняў адносна арганізацыі працэсу фінансавання Віцебскага і Віленскага цэнтральных архіваў старажытных актаў, прыведзена інфармацыя аб абставінах уладкавання губернскіх архіваў у Магілёве і Мінску.

***Ключавыя словы:*** фінансаванне; дзяржаўныя губернскія архівы; Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актаў; Віленскі цэнтральны архіў старажытных актаў.

# ФИНАНСИРОВАНИЕ ГОСУДАРСТВЕННЫХ АРХИВНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ БЕЛАРУСИ В 40-Х – НАЧАЛЕ 60-Х ГГ. XIX В.

***А. В. Ерошевич***

*Белорусский государственный экономический университет,*
*пр. Партизанский, 26, 220070, г. Минск, Беларусь, erash06@rambler.ru*

В статье преимущественно на основе архивных материалов раскрываются аспекты финансового обеспечения организации и деятельности некоторых государственных архивных учреждений Беларуси в 40-х – начале 60-х гг. XIX в. Сделано ряд уточнений и дополнений относительно организации процесса финансирования Витебского и Виленского центральных архивов древних актов, приведена информация об обстоятельствах обустройства губернских архивов в Могилеве и Минске.

***Ключевые слова:*** финансирование; государственные губернские архивы; Витебский центральный архив древних актов; Виленский центральный архив древних актов.

# FINANCING OF THE STATE ARCHIVAL INSTITUTIONS IN BELARUS IN THE 40S – EARLY 60S OF THE XIX CENTURY

***A. V. Yerashevich***

*Belarusian State Economic University,*
*Partyzanskaja Avenue, 26, 220070, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. V. Yerashevich (erash06@rambler.ru)*

The article mainly on the basis of archival materials reveals aspects of financial support for the organization and activities of some state archival institutions in Belarus in the 40s – early 60s of the XIX century. A number of clarifications and additions have been made regarding the organization of the financing process in the Vitebsk and Vilna central archives of ancient acts, information is provided on the circumstances of the arrangement of the provincial archives in Mogilev and Minsk.

***Keywords:*** financing; state provincial archives; Vitebsk Central Archive of Ancient acts; Vilna Central Archive of Ancient Assembly Books.

Пры разглядзе стану архіваў дзяржаўных устаноў у айчыннай гістарыяграфіі асноўная ўвага надаецца высвятленню працэсу фарміравання складу архіўных фондаў, гісторыі пэўных архівасховішчаў, у прыватнасці Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг [14; 15]. Тым не менш, для усебаковага вывучэння тэмы патрабуюць больш глыбокага і ўсебаковага даследавання фінансавыя аспекты стварэння і дзейнасці губернскіх архіваў зыходу прыгонніцкай эпохі.

На тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. было шмат архіваў дзяржаўных, грамадскіх, царкоўных устаноў, прыватных уладальнікаў. Для архіваў дзяржаўных устаноў беларускіх губерняў прыгонніцкай эпохі імператарскай Расіі быў характэрны прынцып дэцэнтралізацыі захоўвання архіўных дакументаў. Адсутнічалі спецыяльныя прыдатныя памяшканні для зберажэння справаводных папер. Так, у 1842 г. архівы губернскіх і павятовых прысутных устаноў Гродзенскай губерні, акрамя губернскага праўлення, большай часткай размяшчаліся ў найманых прыватных дамах [16, l. 26].

Ужо ў першыя гады пасля далучэння да Расійскай імперыі земляў заходняй часткі Літоўскай правінцыі Рэчы Паспалітай царскімі ўладамі прымаліся арганізацыйна-фінансавыя меры для ўладкавання архіва былога Літоўскага трыбунала ў Вільне – вышэйшай апеляцыйнай судовай інстанцыі былога Вялікага Княства Літоўскага, які працаваў з 1582 г. Пазней прынятыя палажэнні ўдакладняліся і паглыбляліся. Згодна з зацверджаным імператарам 13. 10. 1842 г. палажэннем Камітэта міністраў у Вільне засноўвалася Камісія для разбору архіва Літоўскага трыбунала. Часовай камісіі на год вылучалася для выдачы жалавання чыноўнікам 1050 руб. з рэшткаў земскіх збораў Віленскай і Гродзенскай губерняў: былому рэдактару «Виленского вестника» Марціноўскаму 500 руб., памочніку трыбунальнага архіварыуса Нарбуту 200 руб., свяшчэнніку Віленскага Мікалаеўскага сабора Карсакевічу таксама 200 руб., канцылярскаму чыноўніку 150 руб. [12, т. 17–2, № 16080, с. 15]. Па ініцыятыве віленскага губернатара А. В. Сямёнава ў 1842 г. стваралася часовая камісія пры губернскім статыстычным камітэце для агляду архіваў у гарадах Вільне, Коўне, Троках, у манастырах і цэрквах. Такая ж часовая камісія намаганнямі А. В. Сямёнава з мэтай рэвізіі архівасховішчаў і адбору дакументаў з Мінскай губерні ўзнікла ў 1845 г. у Мінску.

Згодна з палажэннем аб парадку справаводства ў губернскіх праўленнях ад 3. 06. 1837 г. пры кожнай установе адкрываўся губернскі архіў. «Наказ губернатарам» 1837 г. замацоўваў палажэнне аб аглядзе архіваў губернскіх устаноў у час рэвізіі. Адпаведна правілаў арганізацыі губернскіх праўленняў 1845 г. губернскім архівам кіраваў архіварыус, якому падпарадкоўваліся памочнікі і перапісчыкі дакументаў. Арганізацыйнае ўмацаванне архіваў ведамства Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) звязана з упарадкаваннем справаводства губернскіх устаноў, у штат якіх уводзілася пасада архіварыуса. У сістэме дзяржаўнага бюракратычнага апарату архіварыусы карысталіся правамі прасоўвання па службе паводле чыноўніцкай табелі аб рангах. У 1834 г. архіварыус прылічаўся да 9 катэгорыі пенсійных акладаў.

5. 01. 1848 г. імператар загадаў заснаваць з дазволу міністра ўнутраных спраў асобныя камісіі для разбору архіўных дакументаў – ужо вырашаных спраў, якія знаходзіліся ў архівах павятовых прысутных устаноў ведамства МУС. Правілы аб парадку справаводства ў губернскіх праўленнях ад 2. 01. 1845 г. прадугледжвалі ўлік дакументальных матэрыялаў і меры па змяншэнні ліку назапашаных вырашаных спраў, якія захоўваліся ў архівах павятовых прысутных устаноў МУС. Цыркуляр МУС паведамляў, што за дазволам на знішчэнне непатрэбных старых дакументаў і ўжо вырашаных спраў, якія не мелі «ніякай гістарычнай і адміністрацыйнай важнасці», неабходна было кожны раз звяртацца праз Камітэт міністраў да імператара (18. 05. 1848 г. гэтае правіла было распаўсюджана і на губернскія ўстановы Міністэрства дзяржмаёмасцей) [6; 12, т. 23–1, № 21865, с. 14; № 22278, с. 349–350]. Праект міністра юстыцыі, разгледжаны ў Дзяржаўным Савеце і падтрыманы 19. 06. 1850 г. імператарам, прызнаваў патрэбу прывядзення ў парадак падведамасных Міністэрству юстыцыі архіваў з аднясеннем выдаткаў на сумы сенацкіх друкарняў [12, т. 25–1, № 24254, с. 556–557].

Для разбірання архіўных дакументаў устаноў Міністэрства юстыцыі ў якасці вопыту ў Віленскай губерні стваралася асобная губернская і 4 павятовыя камісіі. Імператарская станоўчая рэзалюцыя на палажэнне Камітэта міністраў ад 14. 11. 1850 г. засведчыла неабходнасць упарадкавання архіваў судовых устаноў і канцылярый пракурораў і страпчых [12, т. 25–2, № 24642, с. 208–210]. Але ў Дзісне, Вілейцы, Ашмянах не было павятовых вучылішч, і адпаведна адсутнічалі пасады штатных наглядчыкаў вучылішч, як і спецыяльна падрыхтаваныя архівісты. Таму абавязкі ў камісіях для разбору архіваў судовых устаноў былі ўскладзены на дырэктара вучылішч Віленскай губерні, які працягваў

выконваць свае непасрэдныя службовыя абавязкі і быў незнаёмы з асаблівасцямі вядзення архіўнай справы [12, т. 26–1, № 25347, с. 444–445].

Бюракратызацыя дзяржаўнага апарату ў мікалаеўскую эпоху патрабавала ўладкавання губернскіх і павятовых архіваў дзяржаўных устаноў з-за росту справаводнай дакументацыі і неабходнасці зберажэння старых спраў. У Магілёўскім губернскім архіве з 1772 г. знаходзілася да 500 тыс. спраў розных ведамстваў. Пасля вайны 1812 г. яны захоўваліся ў беспарадку, без вопісаў і алфавітаў. Толькі з 1836 г. было прадпісана правесці іх упарадкаванне. Згодна з пастановай Магілёўскага губернскага праўлення ад 30. 05. 1839 г. было прапанавана выдаткаваць фінансавыя сродкі для ацяплення і асвятлення губернскага архіва шляхам прызначэння з кожнай прысутнай установы, справы якіх захоўваліся ў архіве, па 30 руб. асігнацыямі за кожную трэць года. Архіў у Магілёве адчуваў недахоп грашовых сродкаў, неабходных для ўтрымання прыдатных памяшканняў і найму канцылярскіх служыцелей. Аднаразовых выдач невялікіх сум грошай відавочна не хапала. Так, на пакупку паперы для складання вопісаў і алфавітаў, вокладак і «сворок» для звязкі спраў было аднаразова асігнавана з канцылярый губернскага праўлення і губернатарскай у пачатку 1840-х г. толькі 28,57 руб. серабром [5, арк. 1–2, 4 адв., 5]. З мэтай уладкавання губернскага архіва магілёўскі губернскі архітэктар у паданым у Магілёўскае губернскае праўленне рапарце ад 7. 09. 1839 г. склаў 3 каштарысы: на пабудову паліц унутры усёй вежы дома былой ратушы патрабавалася 200,74 руб., на перабудову паліц у губернскім архіве і на выраб ў вокнах жалезных кратаў – 402,37 руб., на рамонт кватэры з кухняй для размяшчэння архіварыуса – 116,61 руб. . З-за цеснаты памяшкання губернскага архіва і адсутнасці свабоднага будынка Магілёўскае губернскае праўленне лічыла прыдатным частку архіва размясціць у вежы гарадской ратушы з водпускам вылічанай па каштарысу сумы грошай з дзяржаўнай казны ці рамонтнай сумы, але не за кошт гарадскіх даходаў. Другі грашовы каштарыс павінен быў задавальняцца за кошт сумы рамонтнага ўтрымання казённых будынкаў. Архіварыуса было вырашана размясціць у казённым будынку, дзе знаходзіліся палаты крымінальнага і грамадзянскага суда. Каштарыс уладкавання ў вежы Магілёўскай гарадской ратушы памяшкання для захоўвання архіўных спраў 6. 03. 1841 г. быў накіраваны з Галоўнага ўпраўлення шляхоў зносін і публічных пабудоў (ГУШЗПБ) у канцылярыю віцебскага генерал-губернатара. ГУШЗПБ, разгледзеўшы праект і каштарыс, прыйшло да высновы, што захаванне архіўных спраў у вежы гарадской ратушы надзвычай небяспечна: пры

пажары іх немагчыма было выратаваць [4, арк. 1–1 адв., 2–2 адв., 32, 37–37 адв., 38–38 адв.].

Згодна з прадпісаннем міністра ўнутраных спраў, выказанага ў прапанове начальніка Мінскай губерні ад 29. 05. 1852 г., губернскаму праўленню пацвярджалася аб неабходнасці напаміну павятовым прысутным установам, каб яны сістэматычна рэвізавалі свае архівы, і прынялі меры да прывядзення іх у парадак. Нагляд за выкананнем гэтага патрабавання даручаўся павятовым страпчым, якія павінны былі агледзець архівы, і накіраваць падрабязныя звесткі ў губернскае праўленне. Высветлілі, што ў 1856 г. архівы былі канчаткова ўладкаваны ва ўсіх павятовых судах, у дваранскіх апеках у Барысаве, Ігумене, Бабруйску, Мазыры, Пінску і Навагрудку; гарадскіх магістратах у Мінску, Мазыры, Рэчыцы, Пінску і Навагрудку; сіроцкіх судах у Мінску і Пінску; гарадскіх думах у Мазыры, Рэчыцы, Пінску; ратушах у Нясвіжы і Докшыцах; земскіх судах у Мазыры, Рэчыцы і Навагрудку; гарадскіх паліцыях у Ігумене, Мазыры і Навагрудку. У іншых мясцовых павятовых дзяржаўных установах архіўныя справы былі прыведзены ў парадак, але на іх яшчэ не былі складзены вопісы і алфавіты. Як сведчаць матэрыялы да губернатарскай справаздачы за 1856 г., у некаторых прысутных установах Мінскай губерні ведамства Міністэрстваў унутраных спраў і юстыцыі зусім не былі складзены вопісы і алфавіты архіўных спраў з прычыны таго, што праводзілася працяглая адборка дакументаў, частковае іх знішчэнне, а таксама высылка старажытных актавых кніг у Віленскі цэнтральны архіў. Да снежня 1856 г. архівы былі канчаткова ўладкаваны ва ўсіх магістратах, акрамя Бабруйскага і Слуцкага, у сіроцкіх судах, апроч Ігуменскага, Бабруйскага і Слуцкага, у земскіх судах, за выключэннем Мінскага і Барысаўскага, у гарадскіх паліцыях, акрамя Мінскай і Рэчыцкай, у павятовых судах, без Барысаўскага, Пінскага, Ігуменскага, Бабруйскага, Слуцкага і Навагрудскага. Загадавалася скончыць уладкаванне архіваў павятовых прысутных устаноў да 1. 02. 1857 г. Невыкананне ў прызначаны тэрмін урадавага распараджэння азначала тое, што ўсе вінаватыя без усялякага тлумачэння падпадалі да судовай адказнасці. Садзейнічанне ў дакладным і «непременном» выкананні прадпісанняў начальства павінны былі аказваць павятовыя страпчыя, якія таксама ў выпадку недастатковага нагляду за ходам справы прыцягваліся да судовай адказнасці [3, арк. 215, 368, 397].

У заходніх губернях імператарскія ўлады адзначалі шматлікія факты дакументальных падлогаў. Прадухіліць гэта павінны асобныя камісіі для

разгляду метрычных і актавых кніг, якія былі засноўваны ў канцы 1833 г. [12, т. 8–1, № 6644, с. 771–772; т. 9–2, № 7495, с. 100]. Але справа не вырашалася з прычыны таго, што чыноўнікі «польскага паходжання» былі зацікаўлены ў захаванні ранейшага стану рэчаў. Новае палажэнне Камітэта міністраў, ухваленае імператарам 3. 11. 1842 г., прадугледжвала новы перагляд і рэвізію актавых і метрычных кніг у заходніх губернях [12, т. 17–2, № 16163, с. 76–78]. Прынятае рашэнне аб заснаванні ў заходніх губернях рэвізскіх камісій актавых і метрычных кніг рэалізоўвалася менш 10 гадоў: у сакавіку 1851 г. імператар загадаў актавым камісіям спыніць працу не пазней 1852 г., а 18. 12. 1851 г. падпісаў палажэнне Камітэта міністраў аб закрыцці праверачных камісій і спыненні іх дзейнасці з 1852 г. [12, т. 26–2, № 25835, с. 174].

Вопіс дакументаў і праверка актавых кніг павінны былі працягвацца да канца 1851 г. Але да 1852 г. аказалася шмат неапісаных дакументаў [13, с. 197–198]. У цэлым, вопісы актавых кніг да прызначага тэрміну было скласці немагчыма з прычыны адстутнасці дастатковавай колькасці кваліфікаванага персаналу пры недахопе археографаў і людзей, зусім непадрыхтаваных да архіўнай працы. Толькі для складання да 1852 г. вопісу старажытных актаў на старaславянскай, лацінскай і польскай мовах і 80400 дакументаў архіва Полацкага павятовага суда і гарадавога магістрата патрабавалася 10-гадзіная штодзённая праца 4 чыноўнікаў з веданнем моў, 4 пісараў і ўпраўляючага. Адчувалася нястача супрацоўнікаў архіва – знаўцаў моў. Віленскі ваенны губернатар І. Г. Бібікаў тройчы пісаў міністру юстыцыі Расійскай імперыі В. М. Паніну з патрабаваннем выдзялення 2000 руб. серабром, якія былі патрэбны для ажыццяўлення дадатковых выдаткаў для складання архіўных вопісаў, але яго запыты засталіся без адказу [9, арк. 5–6, 19].

На дакументы пасля 1800 г. складаліся падрабязныя вопісы, каталогі, паказальнікі, кнігі перанумараваліся, перашнураваліся і забяспечваліся пячаткай. Каталагізацыя дакументаў замаруджвала выдачу даведак ці выпісак з актавых кніг. Разам з тым, перагляд актавых кніг суправаджаўся выяўленнем фактаў іх падробак, крадзяжу, фізічнага пашкоджання з прычыны дрэнных умоў захоўвання. Фальсіфікацыі старажытных дакументаў выклікалі працяглыя адміністратыўна-судовыя спрэчкі, разбіральніцтвы. Разам з тым, выпрацоўка пастулатаў афіцыйнай ідэалогіі пры Мікалаі І абудзіла ў грамадскасці цікавасць да вывучэння і асэнсавання падзей мінулага.

Згодна з прадстаўленнем міністра юстыцыі ад 20. 01. 1852 г. у ведамстве ўзнікла ідэя заснавання ў заходніх губернях цэнтральных архіваў актавых кніг [13, с. 190–210]. План стварэння цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг належыў рэдактару «Вестника Западной России» К. А. Гаворскаму [1, с. 1]. Перадача старажытных актаў на захоўванне ў цэнтральныя архівы павінна была зберагчы іх ад фізічнага пашкоджання, абмежаваць злоўжыванні чыноўнікаў пры выдачы фіктыўных дакументаў, папярэдзіць іх падробкі. Адкрыццё архіва ў Віцебску мела мэтай «сосредоточить в нём драгоценные для Белоруссии документы и сохранить их от всякой случайности, а также оградить более строгим контролем выдачу выписей из актовых книг» [13, с. 15].

З мэтай цэнтралізаванага захоўвання актавых кніг гродскіх, земскіх і іншых судоў, магдэбургій, іншых архіўных спраў цэнтральных устаноў былога Вялікага Княства Літоўскага заходніх губерняў уключна да 1799 г. (за выключэннем Літоўскай метрыкі) імператар Мікалай І падпісаў імянны ўказ Сенату ад 2. 04. 1852 г. (сенацкі ўказ ад 10. 04. 1852 г.) аб заснаванні ў Кіеве, Віцебску і Вільні цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг. Нагляд за цэнтральным архівам у Віцебску ўскладаўся на віцебскага генерал-губернатара, а ў Вільні – на ўпраўленне папячыцеля Віленскай навучальнай акругі (ён таксама знаходзіўся ў ведамстве віленскага ваеннага губернатара). З дзяржаўнага казначэйства на штогадавое ўтрыманне цэнтральнага архіва ў Віцебску адпускалася 1325 руб., у Вільні – 2300 руб. Цэнтральны архіў у Вільні абслугоўваў Віленскую, Гродзенскую, Мінскую, Ковенскую губерні, цэнтральны архіў у Віцебску – адпаведна (Віцебскую і Магілёўскую губерні. У дадатак, было прадпісана асігнаваць аднаразова ў распараджэнне генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага 1000 руб., віленскага ваеннага, гродзенскага, мінскага і ковенскага генерал-губернатара – 2000 руб. Гэтыя сумы адлічваліся на выдаткі, неабходныя для фінансавання збору актавых кніг да 1799 г. уключна ў розных месцах, іх дастаўку у Віцебск і Вільню, на першапачатковае ўладкаванне цэнтральных архіваў. На пакрыццё адпускаемых з дзяржаўнага казначэйства сум для ўладкавання і ўтрымання цэнтральных архіваў загадвалася спаганяць з прыватных асоб за кожную выдаваемую з архіваў выпіску з актавых кніг па 1,5 руб. Рабіць выпіскі з актавых кніг ці завераных гатовых ужо дакументаў маглі непасрэдна наведвальнікі архіваў – прыватныя асобы, ці даверанымя людзі ад імя прысутных устаноў і службовых асоб з унясеннем за гэта па 1,5 руб. за кожную вытрымку са старажытных дакументаў. Для ўліку гэтага пошліннага збору цэнтральныя архівы павінны былі атрымаць ад казённых

палат асобныя шнуравыя кнігі. Сапраўдныя актавыя кнігі дзяржаўным установам і службовым асобам з цэнтральных архіваў не выдаваліся [8, арк. 2, 3 адв., 7–7 адв., 10 адв. –11, 11 адв., 20, 319, 320–320 адв., 324 адв., 325; 7, арк. 3–4; 10, арк. 1–8; 12, т. 27–1, № 26126, с. 228–230, т. 27–2, к № 26126, с. 67; 1, с. 1–4].

Цэнтральны архіў у Вільні размясцілі ў былой зале ўрачыстых пасяджэнняў ранейшай езуіцкай акадэміі і Віленскага ўніверсітэта. А вось у Віцебску для архіва не знайшлі прыдатнага памяшкання. Віцебскі генерал-губернатар адзначыў адсутнасць у Віцебску свабоднага казённага будынка для размяшчэння цэнтральнага архіва. Размяшчэнне ж цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг разам з архівам віцебскіх губернскіх прысутных устаноў было прызнана зусім непрыдатным па многіх прычынах. Цэнтральны архіў параілі змясціць у 3-х частках мураванага двухпавярховага дома калежскага асэсара памешчыка Грынеўскага, а таксама ў мураваным трохпавярховым доме віцебскага купца 3-й гільдыі Гірша Малкіна паблізу дома дваранскага сходу. Генерал-губернатар 30. 09. 1853 г. прасіў дазволу аб прыстасаванні для размяшчэння цэнтральнага архіва сумесна з архівам губернскіх прысутных устаноў скасаванага рымска-каталіцкага фарнага касцёла. Для скарачэння выдаткаў, неабходных на наём дома для размяшчэння цэнтральнага архіва, было прызнана мэтазгодным прыпыніць збор старажытных актавых кніг, ва усялякім разе да ўладкавання памяшкання цэнтральнага архіва. Імператар Мікалай I паводле палажэння Камітэта міністраў загадаў прыстасаваць будынак фарнага касцёла. У снежні 1858 г. выйшла адносіна Віцебскай казённай палаты аб водпуску 4479,61 руб. з мэтай пераробкі фарнага касцёла для размяшчэння ў ім цэнтральнага архіва [8, арк. 250–250 адв., 251, 254, 254 адв., 255 адв., 256, 351–352, 356 адв., 357 адв., 360–360 адв. ; 7, арк. 4–6 адв.]. З прычыны адстутнасці належнага памяшкання цэнтральны архіў у Віцебску пачаў працу ў верасні 1862 г. у ніжнім замку ў памяшканні прыходскай царквы фарнага касцёла разам з архівам губернскага праўлення і былой канцылярыяй віцебскага генерал-губернатара, толькі праз 11 гадоў пасля свайго намінальнага заснавання [2, с. 60].

Намячалася своечасовая дастаўка актавых кніг у цэнтральныя архівы з архіваў губернскіх і павятовых прысутных устаноў. Пры перавозцы старажытных дакументаў улады намагаліся па магчымасці паменшыць казённыя выдаткі. Так, у 1857 г. пры пакетаванні архіваў 11 устаноў Гродзенскай губерні за ўпакоўку актавых кніг арганізацыі патрабавалі 73,9 руб., але па расцэнцы выплацілі ў 3 разы менш – 24,44 руб. [1, с. 7].

Дакументы ўносіліся ў вопіс з пазначэннем нумара дакумента, яго зместу, часу напісання, яўкі ў судовую інстанцыю, лістоў кніг, месца рэгістрацыі. Але заставалася яшчэ безліч неапісаных дакументаў: па падліках чыноўнікаў Міністэрства народнай асветы пры штаце ў 5 чал. Віленскага цэнтральнага архіва для вопісу ўсіх дакументаў старажытных актавых кніг патрабавалася 1568 гадоў [13, с. 136].

У адкрываемых цэнтральных архівах старажытных актаў у Вільне і Віцебску ўзнікла праблема з падборам кваліфікаваных кадраў. Калі на заняцце месца архіварыуса прэтэндавалі некалькі чалавек, то на дапаможныя пасады памочнікаў архіварыуса і пісараў з абмежаванымі акладамі ўтрымання было цяжка знайсці людзей адукаваных, з навыкамі архіўнай працы і веданнем замежных (польскай, лацінскай) і сучаснай рускай літаратурных моў. Пасля пераводу Полацкай духоўнай праваслаўнай семінарыі ў Віцебск яе выкладчык калежскі саветнік Ксенафонт Антонавіч Гаворскі (1821–1871) выказваў жаданне заняць пасаду архіварыуса ў Віцебскім цэнтральным архіве старажытных актаў. На імя начальніка Віцебскай губерні 5. 08. 1852 г. паступіла яго прашэнне ад 23. 07. 1852 г. У просьбе К. А. Гаворскі пісаў, што ён 17 гадоў выкладаў гістарычныя навукі ў Полацкай праваслаўнай духоўнай семінарыі, ведаў польскую, старажытнаславянскую, лацінскую мовы. Акрамя гістарычных ведаў, моўнай спрактыкаванасці, вучоны меў навыкі чытання цяжкіх для прачытання старажытных почыркаў, ужо складаў вопісы рознамоўных дакументаў з актавых кніг Полацкага павятовага суда і гарадавога магістрата, быў членам-карэспандэнтам імператарскага Археалагічнага таварыства і сябрам Камітэта, заснаванага вышэйшым духоўным начальствам для складання статыстычна-гістарычнага апісання Полацкай праваслаўнай епархіі, вывучаў падзеі айчыннай грамадзянскай і царкоўнай гісторыі, «приобрёл сноровку отыскивать и приобретать древние документы от частных лиц», займеў у шматлікіх памешчыкаў Віцебскай губерні ў гэтых адносінах давер, якія ахвотна яму садзейнічалі ў набыцці манускрыптаў. Пазбягаючы выгад ад звання настаўніка духоўнай семінарыі, пенсійных правоў і кватэрнай дапамогі, К. А. Гаворскі даводзіў, што ў першыя гады архіварыуса чакала адказная праца, паколькі было неабходна сістэматызаваць дакументы, скласці вопісы старажытных актаў, дакументальны каталог [8, арк. 131, 211–215 адв.]. К. А. Гаворскі даваў згоду на звальненне з пасады настаўніка і бібліятэкара семінарыі, выказваў жаданне на заняцце пасады архіварыуса ў цэнтральным архіве ў Віцебску, але пры выкананні ўладамі абавязковай умовы: даць яму па службе права

выслугі пэўнай колькасці гадоў з мэтай атрымання поўнага пенсіёну і памеру пенсійных грошай, якімі карысталіся настаўнікі духоўных семінарый [8, арк. 114–114 адв., 115, 219 адв. –220]. Архіепіскап полацкі і віцебскі Васіль Лужынскі адпісаў 15. 07. 1852 г. віцебскаму губернатару С. М. Ярмолаву, што «неуместные условия» прэтэндэнта на званне архіварыуса не заслугоўваюць увагі [8, арк. 113–113 адв.]. Да віцебскага грамадзянскага губернатара С. М. Ярмолава паступіла і другое прашэнне ад 30. 07. 1852 г. з Полацка аб заняцці вакантнай пасады архіварыуса. Яго аўтарам быў 66-гадовы настаўнік Полацкага павятовага дваранскага вучылішча калежскі сакратар Уладзіслаў Міхайлавіч Корсак. Ён даказваў, што быў гатовы заняць пасаду архіварыуса ў цэнтральным архіве ў Віцебску шляхам перамяшчэння, падмацоўваючы сваю здатнасць тым, што меў багаты стаж настаўніцкай працы [8, арк. 130–130 адв.]. У 1858 г. К. А. Гаворскі падаў прашэнне міністру юстыцыі Расійскай імперыі графу В. М. Паніну з просьбай аб заняцці пасады галоўнага архіварыуса ў цэнтральным архіве ў Віцебску [11, арк. 3–4]. Але ершым архіварыусам архіва старажытных актаў у Віцебску стаў А. М. Сазонаў.

Такім чынам, ва ўмовах росту дакументаабароту ўлады намагаліся ў 40-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. уладкаваць працу губернскіх і павятовых архіваў дзяржаўных установў. З мэтай цэнтралізаванага і больш прыдатнага збераджэння старажытных дакументаў, абмежавання службовых злоўжыванняў чыноўнікаў «польскага паходжання» пры выдачы фіктыўных падробленых дакументаў былі арганізаваны асобныя цэнтральныя архівы старажытных актаў у Віцебску і Вільне з пастаянным дзяржаўным утрыманнем. Але іх плённай працы перашкаджалі адсутнасць прыдатных памяшканняў (у Віцебску), нястача кваліфікаваных супрацоўнікаў і ў цэлым невялікі ўзровень фінансавання.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Голуб В. К. Пятидесятилетие Виленского центрального архива древних актовых книг. Исторический очерк 2. 04. 1852–1902. Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1902.
2. Лялин В. А. Витебский центральный архив // Сборник археологического института. СПб.: Тип. Безобразова и К, 1880. Кн. 3. С. 55–82.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 299. Воп. 2. Спр. 4110.
4. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 12263.
5. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 13975.
6. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 19972.
7. НГАБ. Ф. 1416. Воп. 2. Спр. 10778а.
8. НГАБ. Ф. 1416. Воп. 4. Спр. 8241.
9. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 22071.
10. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 22667.

11. НГАБ. Ф 1430. Воп. 1. Спр. 29891.
12. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1884.
13. Сборник материалов, относящихся до архивной части в России. Пг: Тип. Министерства земледелия, 1917. Т. 2.
14. Шумейко М. Ф. Витебский центральный архив древних актовых книг в XIX – начале XX вв. и последующая судьба его документальных собраний // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (середина XIX–XX вв.) / сост. М. В. Пищуленок и др. ; науч. ред. М. Ф. Шумейко. Минск: БЕЛНИИДАД, 2002. С. 4–13.
15. Шумейко М. Витебский центральный архив древних актовых книг – первый исторический архив Беларуси (к 145-летию создания) // Архивы и делопроизводство. 2007. № 4. С. 94–98, № 5. С. 84–87.
16. Lietuvos valstybės istorios archyvas (LVIA). F. 378. 1843. Bib. 1975.

## АРХІВЫ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У СКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ І. ЛУЦКЕВІЧА Ў ВІЛЬНА

***В. С. Іванова***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт,*
*вул. Мендзялеева, 36, 220037, г. Мінск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільна (1921–1945) з'яўляўся не толькі цэнтрам збірання прадметаў гісторыі і культуры Беларусі, але кніг, рукапісаў, асабістых архіваў і архіваў арганізацый. Па захаваных каталогах і вопісах ў артыкуле прасочваецца траекторыя іх збірання, а пасля ліквідацыі музея – іх перамяшчэнне ў складзе дзяржаўных сховішчаў Літвы і Беларусі. Праведзена навуковая рэканструкцыя больш дзесятка архіваў беларускіх арганізацый, што захоўваліся ў Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільна.

***Ключавыя словы:*** архіўная рэканструкцыя; музей; архівы беларускіх арганізацый; каталогі; вопісы**.**

## АРХИВЫ БЕЛАРУСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ В СОСТАВЕ БЕЛАРУСКОГО МУЗЕЯ ИМЕНИ И. ЛУЦКЕВИЧА В ВИЛЬНО

***О. С. Иванова***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Менделеева, 36, 220037, Минск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларуский музей имени И. Луцкевича в Вильно (1921–1945) был не только центром сбора предметов истории и культуры Беларуси, но и книг, рукописей, личных архивов и архивов организаций. На основе сохранившихся каталогов и описей в статье прослеживается путь их собирания, а после ликвидации музея – и их движение в рамках государственных хранилищ Литвы и Беларуси. Проведена научная реконструкция более десятка архивов беларуских организаций, хранившихся в Беларуском музее имени И. Луцкевича в Вильно.

***Ключевые слова:*** архивная реконструкция; музей; архивы беларуских организаций; каталоги; описи.